Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Витебский государственный
университет имени П.М. Машерова»

# ПЕРВАЯ МИРОВАЯ ВОЙНА: ИСТОРИЯ, ГЕОПОЛИТИКА, УРОКИ ИСТОРИИ И СОВРЕМЕННОСТЬ

**(к 90-летию окончания Первой мировой войны и началу формирования Версальско-Вашингтонской системы международных отношений)**

***Материалы международной научной конференции***

Витебск, 11–12 ноября 2008 г.

*Витебск*
*УО «ВГУ им. П.М. Машерова»*
*2008*

УДК 940(04)
ББК 63.3(0)532я4
П26

Материалы научных статей представлены в авторской редакции

Р е ц е н з е н т ы:
ведущий научный сотрудник Института всеобщей истории РАН (г. Москва),
доктор исторических наук *Б.М. Туполев*; ведущий научный сотрудник Института
российской истории РАН (г. Москва), доктор исторических наук *Ф.И. Новик*;
заведующий кафедрой новой и новейшей истории УО «БГПУ им. М. Танка» (г. Минск),
доктор исторических наук, профессор *Г.А. Космач*

Редакционная коллегия:
**В.А. Космач** (главный редактор),
**Г.Н. Яковлева** (заместитель главного редактора),
**А.В. Русецкий, В.И. Каравкин, В.М. Шорец, В.В. Акуневич,**
**Е.В. Гапионок, П.В. Борботько, Д.Н. Савич**

**П26** **Первая мировая война : история, геополитика, уроки истории и современность (к 90-летию окончания Первой мировой войны и началу формирования Версальско-Вашингтонской системы международных отношений)** : материалы международной научной конференции, Витебск, 11–12 ноября 2008 г. / Вит. гос. ун-т; редкол. : В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2008. – 321 с.
ISBN 978-985-425-960-4

Рассмотрены актуальные проблемы из истории Первой мировой войны и межвоенного периода, включая предысторию Первой мировой войны, ее ход, итоги и геополитические последствия, формирование Версальско-Вашингтонской системы международных отношений и другие. Широко представлены материалы по европейской и российской истории, истории Украины и истории Беларуси, культуре, философии, религиоведению, гендерной тематике, правовой культуре, литературоведению, краеведению, педагогике и истории образования.

**УДК 940(04)**
**ББК 63.3(0)532я4**

**ISBN 978-985-425-960-4**

© УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2007

# НАСТУПАЛЬНАЯ АПЕРАЦЫЯ РАСІЙСКІХ ВОЙСК НА ПАЛЕССІ Ў ВЕРАСНІ 1915 ГОДА

***М.В. Цуба***
*(Пінск, ПалДУ)*

Свянцянскі прарыў, які адбыўся ў паўночнай частцы беларускіх земляў, падтрымліваўся на поўдні Беларусі дзеяннямі створанай Бужскай арміі на чале з генералам Лінзінгенам (дадзеная армія была створана на аснове расфарміраванай 11-й германскай арміі). Гэтая армія на працягу ліпеня-жніўня 1915 года змагла з баямі, цеснячы адступаючыя расійскія войскі, прайсці даволі значную тэрыторыю ад Брэста да Пінска [1, с. 48]. Аднак у верасні 1915 года напярэдадні стабілізацыі фронту меў месца нечаканы для немцаў контрудар расійскіх войск у раёне палескага гарадка Лагішын. Баі пад Лагішынам у першую чаргу былі звязаны з мэтай замацавання на больш выгадных прыродных межах, дзеля ўсталявання на лепшых пазіцыях перад зімоўкай і пераходам затым да пазіцыйнай вайны. Акрамя таго, дадзеная аперацыя на Палесссі ў значнай ступені нагадвала дзеянні расійскіх войск па ліквідаванню Свянцянскага прарыву і таксама садзейнічала спыненню далейшага руху наперад германскіх войск.

Аднак у канкрэтнай сітуацыі наспяванне аперацыі адбывалася наступным чынам: 31-шы армейскі корпус пад камандаваннем П.І.Мішчанкі, які ўваходзіў у склад 3-й арміі

Л.В.Леша, пасля доўгага адступлення заняў даволі трывалыя і выгадныя пазіцыі па рацэ Ясельда і Агінскаму каналу. Але канчаткова замацавацца на гэтай мяжы корпусу перашкодзіў не наступаючы праціўнік у выглядзе 41-га германскага корпуса Бужскай арміі, а загад камандуючага 3-й арміяй генерала Леша. Менавіта празмерна асцярожны Леш аддаў загад аб адводзе 18 верасня 1915 года 31-га корпуса далей на ўсход на 10-16 км на сумніўныя пазіцыі па лініі р. Вісліца, Пагост, Вылазы [2]. Камандаванне Заходняга фронту на чале з генералам Эвертам выразіла крайняе незадавальненне такім рашэннем камандуючага 3-й арміяй. У сувязі з чым генерал Леш адсылае новае распараджэнне ў штаб 31-га армейскага корпуса, які толькі што распалажыўся ў мястэчку Лунін, аб вяртанні на ранейшыя пазіцыі. Прасцей гэтую задачу можна было вырашыць у раёне Пінска, так як П.І. Мішчанка па асабістай ініцыятыве аставіў ар'ергард 83-й пяхотнай дывізіі на камандных вышынях па р. Ясельда каля мястэчка Гарадзішча. Іншае становішча складвалася ў раёне Лагішына, дзе ўжо адбыўся поўны адвод расійскіх войск і адпаведна дадзеная тэрыторыя была занятая кайзераўскімі войскамі. У гэты час у склад 31-га корпуса ўваходзілі: 27-я, 75-я, 77-я пяхотная дывізіі. Дзве кавалерыйскіх дывізіі – 2-я гвардзейская і 3-я каўказская казачая, а таксама 1-я брыгада 83-й пяхотнай дывізіі, 9-ты артылерыйскі дывізіён і корпусны авіяцыйны атрад. У выніку кольскасна ў 31-м корпусе налічвалася 12 тыс салдат, 349 афіцэраў і плюс яшчэ прыкамандзіраваных да корпуса 12 казачых соцен (г.зн. 1200 чалавек) [3,с. 6].

З германскага боку дадзеным расійскім войскам супрацьстаяў у палескім рэгіёне 41-шы корпус, у які ўваходзілі: 1-я, 22-я, 107 пяхотныя дывізіі і 81-я, 82-я рэзервовыя дывізіі, Баварская кавалерыйская дывізія [3, с. 5]. Колькасна гэтыя фарміраванні германскіх войск налічвалі каля 12 тыс. чалавек. Аднак напярэдадні правядзення аперацыі 31-м расійскім корпусам, становішча ў вышэй акрэсленых фарміраваннях германскіх войск пачало кардынальна мяняцца. Гэта было звязана з тым, што ў сярэдзіне верасня 1915 года барацьба поглядаў вышэйшага германскага кіраўніцтва ў адносінах да Усходняга (расійскага) фронту завяршылася канчатковым рашэннем аб спыненні тут усялякіх наступальных аперацый, пераходу да добра ўмацаванай абароны і перакідкі асноўных сілаў на іншыя тэатры ваенных дзеянняў. У выніку згодна з нямецкімі архіўнымі матэрыяламі, перад пачаткам аперацыі з 41-га германскага корпуса былі зняты і перадыслацыраваны на іншыя тэатры вайны 1-я, 22-я, 107 пяхотныя дывізіі і Баварская кавалерыйская дывізія, а іх месца занялі колькасна меншыя, слабабаяздольныя рэзервовыя вайсковыя фарміраванні [4, с.578]. Супрацьдзеянні расійскага і германскага карпусоў працягнуліся на адлегласці больш чым на 30 км ад Пінска да Лагішына.

Для наступлення 31-шы корпус вызначыў адрэзак працягласцю каля 10 км у раёне Лагішына. Менавіта на гэтым адрэзку былі сканцэнтраваны ўсе асноўныя сілы корпуса, за выключэннем казачага палка і двух батальёнаў пяхоты з артылярыйскім дывізіёнам. На гэтыя фарміраванні ўскладвалася задача аховы і кантролю за 20 км участкам, а таксама прадугледжваўся заслон супраць пінскай групоўкі кайзераўскіх войск па шляху Пінск – Лагішын. У сваю чаргу 10-ці кіламетровы наступальны фронт быў падзелены на ўчастак 3 км., дзе наступала ўдарная група генерала Штэгельмана (5тыс чал.) і ўчастак 7 км., дзе вяла дзеянні дапаможная група генерала Асмуса (4 тыс. 200 чал.) [5]. Баявыя дзеянні распачаліся раніцай 21(8) верасня 1915 года. Нягледзячы на моцны агонь нямецкай артылерыі ў раёне вёскі Лышча і фальварка Юзэфін, дзе ў ходзе наступлення былі найбольшыя страты (к сярэдзіне дня было 340 забітых), усё ж расійскія войскі змаглі авалодаць першай лініяй абароны праціўніка. На правым флангу (27-я пяхотная дывзія) удалося прасунуцца наперад на 3-4 км, у цэнтры (77-я і 75-я пяхотныя дывізіі) на 4-7 км і на левым флангу (казачы полк) на 15 км. У выніку пасля першага дня боя расійскія войскі выйшлі на аператыўную лінію Забараўцы – Юзэфін – Надатынь – Сташаны [3, с.28]. На занятай лініі яны замацаваліся на ноч, выставіўшы старажавую ахову і выслаўшы разведку да судакранання з праціўнікам. З самай раніцы наступнага дня (22(9) верасня) распачалася артпадрыхтоўка па германскіх пазіцыях. Пасля чаго 27-я і 77-я пяхотныя дывізіі змаглі прасунуцца наперад на 2 км, прыблізіўшыся да мястэчка Мокрая Дубрава.

Немцы, імкнучыся вярнуць страчанае, перайшлі ў контратаку, якая была паспяхова адбіта. У другой палове дня працягвалася наступленне на Мокрая Дубрава. На фронце 105-га пяхотнага Аранбуржскага палка 77-й дывізіі, непадалёку вёскі Дабраслаўка, былі ўзяты два рады нямецкіх акопаў. Полк панёс значныя страты. Падчас боя гэтага палка патрэбна адзначыць подзвіг міласэрнай сястры 10-й роты Рымы Івановай. У ходзе атакі камандзір роты і яго намеснік былі забіты, рота пачала адступаць, але насустрач адступаючым кінулася міласэрная сястра. Яна сабрала вакол сябе ўсіх тых, хто мог трымаць зброю і павяла за сабой у атаку. У выніку натхнёныя такім паваротам падзей салдаты змаглі адкінуць ворага і авалодаць нямецкімі акопамі. Аднак Рыма Іванова была смяротна паранена. Загадам Мікалая II за дадзены подзвіг дваццаціаднагадовая дзяўчына была пасмяротна

ўзнагароджана афіцэрскім ордэнам Святога Георгія IV ступені. Гэта была адзіная жанчына, якая атрымала такую высокую ўзнагароду ў гады Першай сусветнай вайны [6,с.27]. З наступленнем цемнаты спробы авалодаць Мокрай Дубравай былі працягнуты. 299-ы полк 77-й пяхотнай дывізіі ўварваўся на паўднёвую акраіну гэтай вёскі, аднак у хуткім часе быў выбіты адтуль немцамі, страціўшы 50 % свайго складу і далейшую магчымасць новага наступлення. Аперацыя, якая з абодвух бакоў насіла характар барацьбы за вёскі, фальваркі, пэўныя стратэгічныя вышыні, акраіны леса і за акопы праціўніка, была аднаўлена чарговым боем 22(10) верасня. З раніцы 75-я пяхотная дывізія распачала агульны штурм Мокрай Дубравы. Праціўнік, які так упарта абараняў Мокрую Дубраву, прыкрываючы Лагішын вымушаны быў адыйсці за Агінскі канал. Генерал Лінзінген, улічвачы мясцовыя ўмовы, а таксама расцягнутасць вайскавых фарміраванняў 41-га корпуса і яго страты падчас вышэй адзначаных баёў, загадаў кіраўніцтву корпуса адыйсці на новыя пазіцыі і замацавацца за Агінскім каналам і ракой Ясельда [4, с.580]. Астаўлены ў Лагішыне для прыкрыцця адыходу асноўных сілаў нямецкі ар’ергард сур’ёзнага супраціўлення наступаючым расійскім войскам аказаць не змог. Лагішын быў вызвалены. Такім чынам, у ходзе баёў 21(8), 22(9) і 23(10) верасня 41-му германскаму корпусу было нанесена паражэнне, ён вымушаны быў адступіць за раку Ясельда і Агінскі канал, страціўшы значную колькаць салдат і афіцэраў, а таксама ваеннай маёмасці. 31-шы расійскі корпус змог прасунуцца наперад на адлеглаць прыкладна 20 км., што дало магчымасць аднавіць чыгуначны рух паміж Лунінцам і Парахонскам. Дадзеная акалічнасць дазволіла лепей і больш аператыўна забяспечваць падвоз рэзерваў і неабходнага правіянту з тылу на пазіцыі.

Перамога 31-га армейскага корпуса палепшыла яго тактычнае становішча: войскі 31-га корпуса атрымалі добры абзор для абстрэлу з артылерыі, у глыбіні абароны была лесістая мясцовасць, што садзейнічала добрай маскіроўцы вайсковых фарміраванняў. Акрамя таго абарончыя пазіцыі корпуса сталі больш трывалымі, у сувязі з тым, што мелася выгадная сетка шляхоў вузел якой зыходзіўся ў Лагішыне, таксама меўся шэраг населенных пунктаў зручных для размяшчэння розных тылавых ўстаноў. Важным было і тое, што перамога ў гэтай аперацыі пасадзейнічала падняццю маральнага стану расійскіх фармірванняў, паказаўшы, што расійскія войскі могуць наступаць і нават перамагаць немцаў. У якасці трафеяў 31-шы корпус захапіў адну цяжкую гаубічную гармату, 16 кулямётаў, 942 вінтоўкі, 650 лёгкіх і 322 цяжкіх снарадаў і г.д. Было забіта каля 2 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка, 9 афіцэраў і 734 салдата германскіх войск папалі ў палон. Агульныя страты 31-га расійскага корпуса ў гэтых баях каля 3 тыс. 500 чалавек, што склала 27% з ліку тых хто ўдзельнічаў у дадзенай аперацыі. Усяго ж з абодвух бакоў у Палескай аперацыі ўдзельнічала звыш 22 тысяч салдат і афіцэраў [7]. У выніку гэтай пераможнай аперацыі на Палессі, 31-га расійскага корпуса пад Лагішынам, завяршыўся у цэлым манёўраны перыяд вайны на беларускіх землях. Фронт стабілізаваўся. Войскі з абодвух бакоў пачалі замацоўвацца на апошніх занятых межах. Наступіў час пазіцыйнай вайны, які цягнуўся да 1917 года.


1. Мировая война в отдельных операциях. Бои на реке Зап. Буге летом 1915 года. Обработано по данным Германского генерального штаба в 1917 году Капитаном Пэльман. Петербург: Госиздат., 1921. – 57 с.
2. ЦВГА РФ, с. 111, л. 833.
3. Меньчуков, Е.А. Бои под Логишином в 1915 году. Москва: Гос.воен.изд., 1937. – 75 с.
4. Reichsarchiv. Der Weltkrieg 1914-1918/ 8 Band Berlin 1932. – 578 с.
5. ЦВГА РФ, с. 142, л. 486.
6. Шамбаров, В.Е. За веру, Царя и Отечество. Москва: Алгоритм. 2003. – 29 с.
7. М. Савченко. Бои под Логишином в 1915 году // Полесская правда. – 1984. – 6 октября.

## АЛФАВИТНЫЙ УКАЗАТЕЛЬ


Агееў А. **197**
Акуневіч В.У. **202**
Астрога Г.А. **265**
Бароўка В.Ю. **295**
Бахтин В.В. **153**
Бездзель В.Я. **225**
Белова И.Б. **142**
Борботько П.В. **21**
Борылько Е.В. **46**
Братенков Г.М. **253**
Будкина Ю.Б. **145**
Букалова С.В. **137**
Бураков В.Н. **210**
Бычок С.М. **273**
Бяспалая М.А. **189**
Вакар Л.У. **274**
Васіленка Г.Ю. **25**
Вашкевич И.В. **93**
Величко Н.В. **113**
Венгер Ю.И. **230**
Волкова О.А. **125**
Воронецкая И.В. **277**
Габрусевич С.А. **160**
Гай-Ныжнык П.П. **164**
Галимова Н.Г. **282**
Гапионок Е.В. **89**
Гаравая А.А. **235**
Гарматный В.П. **134, 192, 207**
Гащенко Л.А. **300**
Гащенко О.Л. **300**
Гельберг Я.Л. **128**
Головач Е.И. **124**
Горидовец В.В. **260**
Гребенкин И.Н. **147**
Грибко И.Л. **194**
Григорьев В.В. **170**
Гронский А.Д. **188**
Дайняк Е.Н. **186**
Даўгяла М.С. **154**
Дашкевич П. **86, 88, 268**
Дзядзінкін А.Л. **132**
Дорожкин А.Г. **19**
Дулов А.Н. **221**
Елизаров С.А. **208**
Ермоленко Н.А. **128**
Жванко Л.Н. **162**
Жихаревич М.Е. **311**
Жукова А.Э. **9**
Заболотная Л.П. **71**
Зыбин С.Ю. **211**
Иванченко Е.А. **245**
Ивашкевич Е.Ф. **310**
Казачёнок Т.В. **106**
Каламейчук Г.М. **27**
Калиновская М.М. **251**
Каравкин В.И. **288**
Касатая Т.У. **263**
Киселев А.А. **185**
Коваленко О.В. **303**
Коваль В.У. **233**
Ковяко И.И. **118, 120**
Козловский А.В. **292**
Космач В.А. **3, 48, 56**
Космач Г.А. **69**
Космач П.Г. **13, 239**
Косов А.П. **16, 23, 100**
Котович Т.В. **285**
Крайкин В.В. **30**
Краско Г.Г. **238, 259**
Кукса А.Н. **203**
Кумяков М.М. **10**
Кускова С.В. **302**
Кустовский М.Н. **176**
Кухаренко В.Н. **151**
Лавринович Д.С. **200**
Лайша И.В. **279**
Лаўрыненка К.В. **317**
Ливенцев Д.В. **139, 144**
Ливицкий А.Г. **215**
Литвиновская Ю.И. **61**
Литвиновский И.А. **61**
Лукина Л.В. **55**
Масленникова Л.В. **294**
Матченя С.Р. **290**
Махиня О.В. **312**
Мацевич М.Я. **7**
Мигун Д.А. **314**
Миксюк А.С. **108**
Моторов С.А. **177**
Моторова Л.А. **179**
Мусина Н.Е. **217**
Мячикова И.И. **40**
Никитина Н.П. **127**
Николаева И.В. **12**
Николаева Л.А. **248**
Новик Ф.И. **5**
Осипович А. **291**
Падстаўленка В.Ф. **299**
Пархімовіч М.М. **219**
Паршуто И.Н. **47**
Пашкевич Л.Ф. **64**
Петровская О.В. **33**
Пиддубный И.А. **110**
Помалейко О.Л. **174**
Приступа Н.Н. **111**
Протченко В.З. **136**
Пурышева Н.М. **284**
Пушкин В.И. **86**
Пушкін І.А. **255**
Радецкая В.Ф. **199**
Резник А.Н. **205**
Русілка В.І. **319**
Рыжанкоў І.М. **247**
Савіцкая А.М. **297**
Сакович Е.Г. **31**
Сальков А.П. **42**
Самовіч В.В. **195**
Сапожникова Г.Н. **96**
Семенова А.О. **36**
Сивухин О.В. **55**
Сидорова С.О. **10**
Соколов Б.М. **176**
Старовойтов М.И. **226**
Стаценко В.Г. **67**
Стралец М.В. **85**
Страхов В.В. **130**
Субботин О.Г. **104**
Сухарев А.А. **268**
Сухоцкая С.Ю. **228**
Табунов В.В. **244**
Тимофеев Р.В. **10**
Тогулева А.Д. **182**
Трафімчык А.В. **169**
Трофимович Р.Н. **223**
Тугай В.В. **170**
Уваров И.Ю. **103**
Федотова Н.Д. **311**
Ходнев А.С. **63**
Хришкевич Т.Г. **266**
Цуба М.В. **140**
Цымбал А.Г. **257**
Чикалов Р.А. **38**
Чикалова И.Р. **38, 44**
Шелегов А.Д. **181**
Ширма В.Г. **281**
Шматков И.И. **88**
Шорац В.М. **232**
Шорац Л.Ф. **232**
Шумский И.И. **94**
Шупляк П.А. **65**
Юрчак Д.В. **157**
Яковлева Г.Н. **149**
Яремчук В.Д. **159**
Яцишин Н.Г. **270**

Научное издание

**ПЕРВАЯ МИРОВАЯ ВОЙНА: ИСТОРИЯ, ГЕОПОЛИТИКА, УРОКИ ИСТОРИИ И СОВРЕМЕННОСТЬ**

**(к 90-летию окончания Первой мировой войны и началу формирования Версальско-Вашингтонской системы международных отношений)**

Материалы международной научной конференции

Витебск, 11–12 ноября 2008 г.

Технический редактор *А.И. Матеюн*

Компьютерный дизайн *Г.В. Разбоева*

Подписано в печать 27.10.2008. Формат 60х84$^{1}/_{16}$. Бумага офсетная. Гарнитура Таймс.

Ризография. Усл. печ. л. 18,89. Уч.-изд. л. 37,33. Тираж 110 экз. Заказ 144.

Издатель и полиграфическое исполнение – учреждение образования

«Витебский государственный университет им. П.М. Машерова».

Лицензия ЛВ № 02330/0056790 от 1.04.2004.

Отпечатано на ризографе учреждения образования

«Витебский государственный университет им. П.М. Машерова».

210038, г. Витебск, Московский проспект, 33.